КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ
_______________ У.У. Шлыкаў
29/06 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-30-01-33-2016/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КРАЯЗНАЎСТВА І МУЗЕЯЗНАЎСТВА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па факультатыўнай дысцыпліне
для спецыяльнасці:
1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура

2016 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1-03 01 08-2016 па спецыяльнасці 1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура, зацверджанага ____________, рэгістрацыйны № ___

СКЛАДАЛЬНІКІ:
Н.В.Бычкова, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат мастацтвазнаўства;
М.А.Шатарава, старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай тэорыі і методыкі выкладання мастацтва
(пратакол № 14 ад 14 чэрвеня 2016 г.);
Загадчык кафедры Н.В.Бычкова

Саветам факультэта эстэтычнай адукацыі
(пратакол № 10 ад 26 чэрвеня 2016 г.)
Дэкан факультэта І.І.Рыжыкава

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзейнічаючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
ўпраўлення БДПУ
____________ А.А. Краўчанка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па факультатыўнай дысцыпліне “Краязнаўства і музеязнаўства” распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці: 1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура.

Вывучэнне факультатыўнай дысцыпліны “Краязнаўства і музеязнаўства” з'яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў да практычнай працы ў якасці настаўніка сусветнай мастацкай культуры, кіраўніка краязнаўчага гуртка, педагога-арганізатара.

“Краязнаўства і музеязнаўства” – інтэграцыйная факультатыўная дысцыпліна, звязаная з шырокім колам гуманітарных навук. Яна мае істотнае значэнне як для павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню, так і для ўдасканалення вузкаспецыяльных ведаў.

Праграма складаецца з двух раздзелаў. У першым раздзеле разглядаюцца пытанні, звязаныя з гісторыяй развіцця краязнаўчых даследаванняў на Беларусі, формамі арганізацыі краязнаўства ў сучаснай Беларусі, выяўленнем, фіксацыяй і аховай помнікаў гісторыі і культуры, методыкай арганізацыі краязнаўчай работы ў школе. Другі раздзел павінен пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй развіцця музейнай справы, сучасным становішчам музеяў, сістэмай арганізацыі музейнай справы ў сучаснай Беларусі, умовамі стварэння і функцыяніравання музея ўстановы адукацыі.

**Мэта** факультатыўнай дысцыпліны – знаёмства з тэорыяй і гісторыяй музейнай справы, падрыхтоўка будучага настаўніка да самастойнай краязнаўчай работы.

**Задачы** факультатыўнай дысцыпліны:

- знаёмства з гісторыяй развіцця краязнаўчых даследаванняў на Беларусі, формамі арганізацыі краязнаўства ў сучаснай Беларусі,
- знаёмства з гісторыяй развіцця музейнай справы, сучасным становішчам музеяў, сістэмай арганізацыі музейнай справы ў сучаснай Беларусі, умовамі стварэння і функцыяніравання музея ўстановы адукацыі;
- вывучэнне спосабаў выяўлення, фіксацыя і аховы помнікаў гісторыі і культуры;
- авалоданне методыкай арганізацыі краязнаўчай работы ў школе;
- фарміраванне ўменняў выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял і музейную інфармацыю падчас вучэбнага і выхаваўчага працэсу ў школе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Узаемасувязь факультатыўнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з факультатыўнай дысцыплінай “Краязнаўства і музеязнаўства” | Пералік актуалізуемых на занятках па факультатыўнай дысцыпліне “Краязнаўства і музеязнаўства” комплексаў ведаў, што фарміруюцца на іншых вучэбных дысцыплінах |
|---|---|
| Сусветная мастацкая культура | Гісторыя развіцця і сучасны стан буйнейшых музеяў свету |
| Мастацкая культура Беларусі | Музейная сетка Беларусі і дзейнасць сучасных беларускіх музеяў |
| Методыка выкладання сусветнай мастацкай культуры | Методыка і формы арганізацыі краязнаўчай работы, выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу і музейнай інфармацыі падчас вучэбнага і выхаваўчага працэсу ў школе |

### Патрабаванні да засваення факультатыўнай дысцыпліны

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу факультатыўнай дысцыпліны “Краязнаўства і музеязнаўства” вызначаны адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура.

Вывучэнне факультатыўнай дысцыпліны “Краязнаўства і музеязнаўства” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асабістых і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый

Студэнт павінен:

– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

– АК-4. Умець працаваць самастойна.

– АК-5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

– АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

– АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

Патрабаванні да сацыяльна-асабістых кампетэнцый

– СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

– СЛК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

– СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабістых камунікацый.

– СЛК-7. Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый

– ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

У выніку вывучэння факультатыўнай дысцыпліны “Краязнаўства і музеязнаўства” студэнт павінен:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ведаць:**

- месца краязнаўства ў сістэме навуковых дысцыплін;
- методыку і формы арганізацыі краязнаўчай работы;
- структуру музеязнаўства, асноўныя напрамкі і школы ў музеязнаўстве;
- сацыяльна-культурныя функцыі музея;
- формы арганізацыі музейнай справы;
- гісторыю развіцця і сучасны стан буйнейшых музеяў свету;
- асаблівасці фарміравання і дзейнасці музейнай сеткі Беларусі;

**умець:**

- арганізоўваць краязнаўчую работу і работу школьнага музея;
- выяўляць, фіксаваць, збіраць і класіфікаваць гісторыка-культурныя каштоўнасці;
- выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял і музейную інфармацыю падчас вучэбнага і выхаваўчага працэсу ў школе;

**валодаць:**

- тэрміналогіяй дысцыпліны;
- формамі музейнай камунікацыі;
- навыкамі культурна-асветніцкай дзейнасці.

Згодна з вучэбным планам спецыяльнасці 1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура факультатыўная дысцыпліна “Краязнаўства і музеязнаўства” вывучаецца студэнтамі дзённай формы атрымання адукацыі ў 1 семестры.

Усяго на вывучэнне факультатыўнай дысцыпліны “Краязнаўства і музеязнаўства” на дзённай форме атрымання адукацыі адводзіцца 32 гадзіны, усе аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 16 гадзін лекцыйных заняткаў, 16 гадзін семінарскіх заняткаў. Гадзіны на самастойную працу студэнтаў вучэбнымі планамі не прадугледжаны.

Аўдыторныя гадзіны для дзённай формы атрымання адукацыі размяркоўваюцца наступным чынам:

1 курс 1 семестр – 32 гадзіны (16 лекцыйных + 16 семінарскіх).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. Краязнаўства

### Тэма 1.1 Уводзіны. Гісторыя развіцця краязнаўства на Беларусі

Краязнаўства як сістэма ведаў аб пэўнай тэрыторыі, вывучэнне гістарычных, палітычных, культурных, прыродных і іншых фактараў яе фарміравання і развіцця.

Формы арганізацыі краязнаўства (дзяржаўнае, грамадскае, школьнае).

Выяўленне і фіксацыя (ахова) помнікаў гісторыі і культуры – галоўная задача краязнаўства. Асноўныя віды помнікаў гісторыі і культуры.

Заканадаўчыя дакументы Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні помнікаў. Дзяржаўныя і грамадскія ўстановы, якія займаюцца аховай гістарычнай спадчыны.

Вывучэнне духоўнай і матэрыяльнай культуры асобных рэгіёнаў Беларусі ў XVII–XVIII стст. Краязнаўчыя матэрыялы ў прыватных калекцыях музейнага тыпу (“Сапежанскі збор”, калекцыя У. Храптовіча ў в. Шчорсы, А. Тызенгаўза ў Гародні, археалагічныя калекцыі К. і Я. Тышкевічаў у Лагойску, палацавая галерэя А.К. Ельскага ў Замосці і інш.). Прынцыпы краёвага вывучэння культуры Беларусі ў пачатку XIX ст.

Уплыў на вывучэнне гісторыі, культуры, прыроды Беларусі Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, Таварыства вывучэння Магілёўскай губерніі, царкоўна-археалагічных камітэтаў і музеяў, Мінскага “Таварыства аматараў прыроды, этнаграфіі і археалогіі”.

Змены ў беларускім краязнаўстве пасля 1917 г. (усталяванне савецкай улады). Слуцкае павятовае таварыства “Папараць-кветка” 1918 г. Цэнтральнае бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры (1924 г.), часопіс “Наш край” (1925 г.). Першы ўсебеларускі краязнаўчы з’езд (1926 г.). Узнікненне сеткі краязнаўчых музеяў. Ідэалагізацыя краязнаўчага руху ў сярэдзіне 30-х г. Краязнаўства на Беларусі ў пасляваенны перыяд. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1965 г.). Секцыя па краязнаўству пры фондзе культуры БССР.

Закон Рэспублікі Беларусь аб ахове помнікаў гісторыі і культуры.

### Тэма 1.2 Помнікі археалогіі ў краязнаўстве

Археалогія як навука. Крыніцы, мэты і задачы археалагічнага даследавання. Археалагічныя крыніцы па гісторыі і культуры роднага краю.

Асноўныя групы археалагічных помнікаў (пасяленні і пахаванні).

Віды пахавальных помнікаў: грунтовыя могільнікі і курганы. Эвалюцыя пахавальнага абраду. Неўмацаваныя і ўмацаваныя пасяленні: стаянкі, паселішчы, гарадзішчы, гарады, замкі, крэпасці. Помнікі вытворчай дзейнасці: шахты, майстэрні і г. д. Іншыя віды археалагічных помнікаў.

Заканадаўства ў галіне аховы помнікаў археалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асаблівасці аховы археалагічных помнікаў (ахоўная зона, зона рэгуляванай забудовы і г. д.).

Этапы археалагічных даследаванняў. Палявыя даследаванні: археалагічны пошук і раскопкі. Археалагічны пошук як найбольш перспектыўны метад выяўлення археалагічных аб’ектаў. Археалагічныя раскопкі.

Асаблівасці даследавання розных катэгорый помнікаў. Першасная (палявая) і лабараторная апрацоўка археалагічных матэрыялаў. Методыка датавання ўзросту помніка. Класіфікацыя і тыпалогія археалагічных знаходак. Рэстаўрацыя і кансервацыя археалагічных знаходак.

Выкарыстанне археалагічных матэрыялаў у школе. Актывізацыя вучэбнага і выхаваўчага працэсаў з дапамогай археалагічнага матэрыялу. Методыка падрыхтоўкі і правядзення школьнай экспедыцыі. Палявыя даследаванні. Патрабаванні да вядзення палявой дакументацыі (дзённік экспедыцыі, вопісы, этэкітаж знаходак). Захаванне археалагічных матэрыялаў у школе.

## Тэма 1.3 Нумізматыка ў краязнаўстве

Паняцце аб нумізматыцы. Яе месца сярод іншых навук. Станаўленне і развіццё нумізматыкі на Беларусі. Калекцыяніраванне манет у старажытнасці і цяпер. Пераход ад аматарскага збору манет да навукова-аналітычнага даследавання. Узаемасувязь нумізматыкі з гісторыяй, этнаграфіяй і іншымі дысцыплінамі. Галоўныя аспекты нумізматычных даследаванняў. Матэрыяльныя і вонкавыя характарыстыкі манет. Тэхніка і тэхналогія манетнай вытворчасці.

Даманетныя сродкі грашовага звароту. Старажытныя крыніцы аб прычынах і часе з’яўлення манет. Старажытныя цэнтры манетнай чаканкі (Лідзія, Эгіна). Манетныя скарбы як галоўны спосаб захоўвання каштоўнасцей у старажытнасці і сярэднявеччы. Асноўныя прынцыпы датавання скарбаў.

Навуковая апрацоўка нумізматычных помнікаў. Выкарыстанне нумізматычных помнікаў у школе. Чыстка і кансервацыя манет. Кансервацыя манет. Умовы захавання манетных калекцый.

Асаблівасці выкарыстання манет падчас урока, лекцыі (ілюстрацыйны фонд, фотаздымкі, слайды, муляжы). Выкарыстанне музейных калекцый і калекцыі нумізматаў-аматараў.

Гісторыя грашовага звароту на Беларусі. Першыя манеты на тэрыторыі Беларусі. Дынарыі Рымскай імперыі, манеты іншых дзяржаў. Абмежаваны характар функцыі антычных манет сярод усходнеславянскіх плямёнаў. Перыяд куфічнага дырхама**.** Прычыны і шляхі яго распаўсюджвання на ўсходнеславянскіх землях. Перыяд заходнееўрапейскага дынарыя**.** Прычыны і шляхі яго паступлення на ўсходнеславянскія землі. Візантыйскія манеты ў грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі. Першыя ўсходнеславянскія манеты. Прычыны чаканкі і абмежаванасці выкарыстання. Безманетны перыяд (60-я гг. XI ст. – XIII ст.). Срэбраныя і залатыя злiткі (грыўны, рублі). Віды зліткаў (кіеўскі, літоўскі, наўгародскі), іх знешні выгляд і метралагічныя характарыстыкі. Вішчынскі скарб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XV стст. Першыя манеты ВКЛ – Літоўскія дынарыі (пенязі), этымалогія назвы. Манеты іншых краін на тэрыторыі Беларусі: шылінгі Лівонскага ордэна, дырхамы і пулы Залатой арды, дукаты Венгрыі, ноблі Англіі. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XV – срэдзіне XVI ст. Віленскі манетны двор, галоўныя наміналы яго вытворчасці. Манетная прадукцыя Польшчы на грашовым рынку Беларусі. Медныя і срэбраныя капейкі Расіі на тэрыторыі Беларусі. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII – сярэдзіне XVIII ст. Галоўныя манетныя двары на тэрыторыі Беларусі і іх прадукцыя. Крызісныя з'явы ў грашовай гаспадарцы Рэчы Паспалітай. Гродзенскі манетны двор. Пачатак папярова-грашовай эмісіі Рэчы Паспалітай. Расійскія манеты на рынках Беларусі.

Канец XVIII ст. – 1917 г. – узмацненне пазіцый расійскай манеты ў грашовым абарачэнні на Беларусі. Польска-літоўскія і заходнееўрапейскія манеты. Фальшываманецтва на тэрыторыі Беларусі. Манеты Герцагства Варшаўскага і Царства Польскага. "Мяцежныя манеты", расійска-польскія двухмоўныя манеты. Рэформы 1839–1843, 1895–1897 гг. Павелічэнне тыражоў папярова-грашовай эмісіі. Савецкія манеты. Грашовая рэформа 1922–1924 гг. Першыя папяровыя грошы і манеты СССР. Увядзенне новага манетнага тыпу (1935 г.). Грашовыя рэформы 1947 і 1961 гг. Чаканка мемарыяльных манет. Апошнія манеты СССР (1991 г.).

Грашовыя знакі Рэспублікі Беларусь.

## Тэма 1.4 Геральдыка ў краязнаўстве

Геральдыка як навуковая дысцыпліна. Яе сувязь з гісторыяй, археалогіяй, нумізматыкай, геніалогіяй і інш. Вытокі геральдыкі. Станаўленне геральдыкі як навукі.

Станаўленне і развіццё геральдыкі на Беларусі. Герб – знак, выкананы па законах геральдыкі. Віды гербаў: дзяржаўныя, зямельныя (гарадскія, губернскія і г. д.), карпаратыўныя, радавыя.

Асноўныя правілы геральдыкі. Спалучэнне і сімволіка колераў, геральдычныя і негеральдычныя выявы, шафіроўка. Гарадскі герб як сімвал нежалежнасці горада. Тыпалогія гарадскіх гербаў Беларусі. Функцыянальныя гербы. Дзяржаўная, абарончая і гаспадарчая сімволіка гарадскіх гербаў. Штучныя гербы. Элементы прыватнаўласніцкай геральдыкі і рэлігійнай сімволікі ў гарадскіх гербах.

Этапы развіцця гарадской геральдыкі Беларусі. Раннегеральдычны (да XVI ст.). Геральдычны (XVI – канец XVIII ст.) Познегеральдычны (апошняя чвэрць XVIII ст. – першыя дзесяцігоддзі XX ст.). Гарадская геральдыка Беларусі на сучасным этапе.

## Тэма 1.5 Тапаніміка ў краязнаўстве

Тапаніміка як раздзел анамастыкі – навукі аб прыватных назвах. Раздзелы анамастыкі. Тапаніміка – навука аб паходжанні і развіцці геаграфічных назваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

месца сярод іншых навук. Тапаніміка і мовазнаўства, геаграфія і гісторыя. Асноўныя заканамернасці тапанімікі. Прынцыпы класіфікацыі геаграфічных назваў (моўная, семантычная). Тэрміналогія тапанімікі: тапанімічнае асяроддзе, тапанімічныя групы (класы). Тапанімічныя пласты і фарманты. Прынцыпы перадачы геаграфічных назваў на картах. Трансфармацыя геаграфічных назваў. Практычнае значэнне тапанімікі.

Вытокі геаграфічных назваў Беларусі (фактары фарміравання тапонімаў) Беларусі). Сувязь фарміравання тапаніміі Беларусі з этнічнай гісторыяй і працэсамі засялення яе тэрыторыі. Шляхі станаўлення тапонімаў Беларусі.

Фактары фарміравання тапонімаў: лінгвістычны, гістарычны, этнічны, прыродны, афіцыйныя змены назваў. Народная тэрміналогія ў тапонімах Беларусі. Прыроднае асяроддзе ў тапонімах Беларусі. Этнатапонімы. Рэлігійна-культавыя тапонімы. Народная і навуковая этымалогія геаграфічных назваў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 1.6 Пісьмовыя крыніцы ў краязнаўстве. Архівы і іх фонды

Архівы – навукова-даследчыя ўстановы або аддзелы ўстаноў, якія збіраюць і захоўваюць дакументы. Архівы – сукупнасць дакументаў, што назапашваюцца ў выніку дзейнасці ўстаноў або прыватных асоб. Архівы як сховішча пісьмовых крыніц.

Гісторыя архіўнай справы. Першыя архівы на тэрыторыі нашай дзяржавы (Метрыка ВКЛ, архівы гарадскіх адміністрацый і магнатаў). Самастойныя архіўныя ўстановы ў XIX ст. Рэарганізацыя і цэнтралізацыя архіўнай справы пасля ўсталявання савецкай улады. Заснаванне адзінага дзяржаўнага архіўнага фонду.

Сістэма арганізацыі архіўнай справы ў сучаснай Беларусі. Цэнтральныя дзяржаўныя архівы і іх філіялы. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (Мінск, Гродна), Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь, ЦДА кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск). Стварэнне нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (1992 г.).

Структура архіва (функцыянальныя падпарадкаванні архіва). Правілы работы ў архіве. Пошукавыя сістэмы (даведнікі, рэестры вопісаў, спісы фондаў, картачныя каталогі і г. д.). Паслядоўнасць і методыка работы з архіўнымі дакументамі.

## Тэма 1.7 Методыка арганізацыі краязнаўчай работы ў школе

Асноўныя формы краязнаўчай работы ў школе: класныя і пазакласныя. Масавыя, групавыя і індывідуальныя формы работы.

Выкарыстанне краязнаўчых матэрыялаў на ўроках. Пазакласная краязнаўчая работа. Работа школьнага краязнаўчага музея.

Арганізацыя і правядзенне краязнаўчых паходаў, экскурсій, экспедыцый. Выбар мэты, вызначэнне задачы. Нарматыўныя дакументы аб правядзенні паходу, экскурсіі, экспедыцыі. Гігіена турыста. Самакантроль і віды першай дапамогі ў паходзе. Вывучэнне раёна паходу, экскурсіі, экспедыцыі.

Распрацоўка маршруту, графік руху, схема маршруту. Запісы гісторыка-краязнаўчых назіранняў. Вядзенне дзённіка. Падвядзенне вынікаў паходу, экскурсіі, экспедыцыі.

Краязнаўчы гурток – асноўная форма пазакласнай краязнаўчай работы ў школе. Мэты і задача гуртка. Накіраванасць гуртка (гісторыка-культурная, гісторыка-літаратурная і г. д.) у залежнасці ад канкрэтных умоў і ўзроставых асаблівасцей дзяцей. Камплектаванне гуртка. Распрацоўка праграмы работы гуртка. Спалучэнне ў ёй розных форм работы: тэарэтычнай, практычнай, самастойнай, экскурсій, паходаў, экспедыцый.

## Раздзел ІІ. Музеязнаўства

### Тэма 2.1 Уводзіны. Музей як сацыяльны інстытут

Роля музея ў захаванні агульначалавечай спадчыны. Этымалогія паняцця "музей". Сацыяльна-культурныя функцыі музея ў сучасным грамадстве.

Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна, яе месца ў сістэме іншых навук. Прадмет даследавання музеязнаўства. Асноўныя паняцці музеязнаўства: музей, музейны прадмет, музейная справа.

Гісторыя ўзнікнення і развіцця музея як сацыяльнага інстытута. Перадмузейны перыяд збіральніцтва. Працэс назапашвання рэчаў у першабытнам грамадстве: зборы эканамічнага значэння і сацыяльнага прэстыжу. Прыватнае збіральніцтва ў краінах Старажытнага Усходу, калекцыі культавых рэчаў, мастацкіх твораў, матэрыяльных каштоўнасцей у храмах, палацах, бібліятэках Старажытнага Егіпта, Вавілона, Асірыі і інш. Зборы мастацкіх каштоўнасцей у храмах антычных гарадоў – правобразы мастацкіх музеяў.

Перадмузейныя формы збіральніцтва ў перыяд Сярэднявечча: калекцыі культавых рэчаў у цэрквах і манастырах.

Змены ў падыходах да прыватнага збіральніцтва ў эпоху Адраджэння. Узнікненне сістэматычных калекцый мастацкіх твораў, натуральных рэчаў музейнага прызначэння: мюнцкабінеты, натуркабінеты, кунсткамеры. Калекцыі твораў мастацтва ў Ватыкане, калекцыі сям'і Медзічы ў Фларэнцыі. Дзяржаўныя скарбніцы. Заснаванне кунсткамеры ў Дрэздэне. Аружэйная палата ў Маскве.

Музейная справа ў эпоху Асветніцтва (другая палова XVII – XVIII ст.). Адлюстраванне асветніцкай ідэалогіі ў музейнай справе. Перамены ў падыходах да калекцыяніравання ў другой палове XVII ст., звязаныя са зменай сацыяльных функцый збіральніцтва. Росквіт палацавых калекцый. Эрмітаж (Санкт-Пецярбург), Луўр (Парыж), Цвінгер (Дрэздэн). Абмежаванасць для наведвання першых імператарскіх музеяў. Пераход да перыядычнай закупкі мастацкіх твораў. Першыя спробы класіфікацыі музейных прадметаў і спецыялізацыі музеяў, звязаныя з развіццём і дыферэнцыяцыяй навук. Адкрыццё першых публічных музеяў. Брытанскі музей (1753), Луўр (1793). Пецярбургская кунсткамера (1719) – першы публічны музей Расіі. Асаблівасці прыватных палацавых галерэй і калекцый. Роля збіральніцтва ў развіцці навукі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацкай культуры. Лёс калекцыі Чартарыйскіх. Калекцыі сям'і Баргезе (Рым), галерэі Піцці і Уфіцы (Фларэнцыя).

Музейная справа ў XIX – пачатку XX ст. "Залаты век" музеяў мастацкага профілю. Рэарганізацыя існуючых мастацкіх музеяў і адкрыццё новых. Прада (1819), Лонданская Нацыянальная галерэя (1824), Старая Мюнхенская пінакатэка (1836).

Уплыў росту нацыянальнай самасвядомасці на развіццё нацыянальных музеяў. Першыя спробы стварэння канцэпцыі нацыянальнага музея Ф. Адэлунга (1817). Узнікненне самастойных музейных устаноў шырокага гістарычнага профілю. Венгерскі Нацыянальны музей у Будапешце (1802), Нацыянальны музей у Празе (1818), Стары музей у Берліне (1828), Нацыянальны музей у Кракаве (1879), Егіпецкі музей у Каіры (1858) і інш. Рост і ўскладненне сеткі музеяў гістарычнага профілю, з'яўленне спецыялізаваных археалагічных музеяў. Развіццё ваенна-гістарычных музеяў. Літаратурна-мемарыяльныя музеі. Музей Шылера ў Марбахе (1857), музей Гётэ ў Веймары (1886).

Роля мецэнатаў і інтэлігенцыі ў стварэнні новых музеяў і развіцці музейнай справы. Асаблівасці ўтварэння Метраполітэн музея ў Нью-Йорку (1870). Дзейнасць І.В. Цвятаева па стварэнні "Музея прыгожых мастацтваў" (1890). "Маскоўская гарадская галерэя Паўла і Сяргея Траццяковых" (1856; 1892). Павелічэнне ролі музеяў у навуковай і адукацыйнай дзейнасці.

Навукова-даследчая і навукова-адукацыйная функцыі музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Навуковыя музеі і музеі пры навучальных установах. Ашмоліян-музей у Оксфардзе (1845). Мастацка-прамысловыя музеі і музеі рамёстваў, прамысловыя і тэхнічныя музеі. Кенсінгтонскі музей навукі і тэхнікі (1852), Маскоўскі політэхнічны музей (1872). Стварэнне новага тыпу музея – музея пад адкрытым небам. Дзейнасць А. Хазеліуса па стварэнні "Скансэна" (1891). Асноўныя фактары павелічэння колькасці музеяў пад адкрытым небам у краінах паўночнай Еўропы ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Асаблівасці развіцця музеяў Еўропы і Амерыкі ў сярэдзіне – канцы XX ст. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы, пагаршэнне ў выніку гэтага навукова-даследчай, збіральніцкай, фондавай і культурна-адукацыйнай працы. Страты музейных каштоўнасцей падчас другой сусветнай вайны.

Пашырэнне сферы дзейнасці музеяў у другой палове XX ст. Развіццё музейнай справы ў розных рэгіёнах свету пасля вайны. Фарміраванне і развіццё музеялогіі як навуковай дысцыпліны. Стварэнне сеткі музейных навуковых і даследчых цэнтраў. Сучасныя тэндэнцыі і напрамкі ў развіцці музеязнаўства. Экамузеялогія. Асноўныя прынцыпы арганізацыі і дзейнасці экамузеяў. Першыя тэарэтычныя і практычныя спробы рэалізацыі ідэі стварэння экамузеяў у Францыі. Музей чалавека і прамысловасці абшчыны Ле Крэзо. Міжнародны рух за новую музеялогію.

Міжнародныя музейныя ўстановы (ICOM, 1964).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 2.2 Гісторыя развіцця музейнай справы ў Беларусі

Крыніцы вывучэння музейнай справы (арыгінальныя апісанні і каталогі, музеязнаўчыя выданні, каталогі музеяў, манаграфічныя даследаванні, працы музеяў, музеязнаўчыя часопісы і г. д.).

Старажытнабеларускае збіральніцтва (вялікакняжацкія зборы і зборы рэчаў культавага прызначэння). Прыватнае збіральніцтва. Калекцыі унікальных помнікаў матэрыяльнай культуры, фамільных рэліквій, рэдкіх кніг, рукапісаў у маёнтку Радзівілаў у Нясвіжы, “Сапежанскі збор”.

Перамены ў падыходах да прыватнага калекцыяніравання ў другой палове XVIII ст. Палацавыя галерэі і прыватнашляхецкія зборы І. Храптовіча (Шчорсы), А. Тызенгаўза (Гродна) і інш. Узнікненне першых музеяў пры навучальных установах, іх роля ў развіцці даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, дакладных навук. Музей пры Полацкай калегіі езуітаў. “Кабінет натуральнай гісторыі” Гродзенскай медыцынскай школы.

Драбленне і вываз калекцый з беларускіх зямель пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Лёс “Музеўма айчыннай прамысловасці” Горы-Горыцкага прамысловага інстытута. Віленскі музей старажытнасцей – першы агульнадаступны музей на Беларусі (1856).

Тэндэнцыі развіцця музеяў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Царкоўна-археалагічныя музеі, музеі пры земствах, навуковых таварыствах, навучальных установах. Прыватныя калекцыі ў другой палове XIX ст.

Змены ў музейнай справе пасля 1917 г. Заканадаўчыя акты савецкага ўрада па музейнай справе. Нацыяналізацыя культурна-гістарычных каштоўнасцей. Дзяржаўныя ўстановы па кіраванні музеямі. Стварэнне музейнай сеткі і нацыянальнага музейнага фонду.

Беларускі дзяржаўны музей і яго філіялы. Роля М. Шчакаціхіна ў стварэнні нацыянальнага беларускага музея. Краязнаўчыя музеі ў Заходняй Беларусі. Развіццё Беларускага музея І. Луцкевіча ў Вільні (1921–1946 гг.). Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Палескі музей у Пінску. Дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы ў 30-я гг. XX ст., рабаўніцтва і продаж найкаштоўнейшых музейных прадметаў, рэпрэсіі ў адносінах да супрацоўнікаў музеяў.

Музеі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Страты часткі музейнага фонду падчас акупацыі.  Аднаўленне і развіццё музейнай сеткі ў пасляваенны час. Змяненне сістэмы кіравання музеямі, падпарадкаванне музеяў Міністэрству культуры БССР. Пашырэнне музейнай сеткі. Павелічэнне колькасці музеяў ваенна-гістарычных, мемарыяльных, працоўнай і баявой славы. Рост сеткі грамадскіх музеяў. Звужэнне функцый музеяў у 50–70-я гг., падпарадкаванне іх палітычным мэтам. Праблемы забеспячэння музеяў спецыялістамі.

## Тэма 2.3 Сістэма арганізацыі музейнай справы ў сучаснай Беларусі

Характарыстыка сучаснага становішча музейнай справы ў Беларусі. Законы Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” (1992), “Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь” (1996).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Класіфікацыя музеяў. Прынцыпы дзялення музеяў на групы. Дзяленне музеяў па юрыдычным статусе (дзяржаўныя, грамадскія, прыватныя). Якасная тыпалогія (публічныя, навуковыя, вучэбныя). Дзяленне музеяў па іерархічнай падпарадкаванасці (цэнтральныя, мясцовыя, абласныя і г. д.). Ведамасная прыналежнасць музеяў.

Асноўныя профільныя групы музеяў. Музеі комплекснага профілю. Тыпы музеяў (музей пад адкрытым небам, скансэн, музей-запаведнік, мемарыяльны музей, дом-музей і г. д.). Музей народнай архітэктуры і побыту. Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе”. Полацкі гісторыка-архітэктурны музей-запаведнік.

Музейная сетка Беларусі. Галаўны музей і яго філіялы. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі, Нацыянальны мастацкі музей, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, філіялы рэспубліканскіх музеяў, абласныя музеі, мясцовыя краязнаўчыя музеі.

Катэгорыі музея. Параметры вызначэння катэгорыі музея (месца ў дзяржаўнай сістэме музеяў, аб’ём асноўнага фонду, экспазіцыйная плошча, колькасць наведванняў і г. д.).

## Тэма 2.4 Структура музея і асноўныя напрамкі дзейнасці. Навукова-фондавая работа музея

Структурныя аддзелы сучаснага музея. Навуковая рада, яе роля ў каардынацыі дзейнасці музея. Навукова-метадычная рада, яе задачы па пытаннях камплектацыі, экспазіцыйнай, культурна-адукацыйнай дзейнасці і г. д. Фондава-закупачная камісія. Вызначэнне каштоўнасці і мэтазгоднасці закупкі тых або іншых прадметаў, уключэнне іх у склад таго ці іншага збору, калекцыі і г. д. Навуковыя аддзелы, іх месца ў структуры музея.

Фарміраванне фондавага збору – асноўны напрамак дзейнасці музея. Навуковая канцэпцыя камплектавання – сістэмнае ўяўленне аб мэтах, напрамках, формах і метадах камплектавання фондаў музея і як аснова дзейнасці ўсіх падпарадкаванняў музея. Метады камплектавання (тэматычнае і сістэматычнае). Формы камплектавання (збіральніцкая дзейнасць, экспедыцыя, камандзіроўка). Формы бягучага камплектавання (закупка, абмен, перадача ў дар, перадача на часовае захаванне).

Улік і захаванне музейных фондаў. Нарматыўныя дакументы па ўліку і захаванні. Уліковая навукова-фондавая дакументацыя як умова юрыдычнай аховы музейнага збору.

Склад і структура музейных фондаў. Асноўныя элементы структуры музейных фондаў. Вывучэнне і навуковае апісанне музейных прадметаў. Атрыбуцыя. Вызначэнне аўтэнтычнасці, сапраўднасці. Музейная каштоўнасць прадмета. Вопісы калекцый.

Забеспячэнне захаванасці музейных прадметаў у спецыяльна прыстасаваных фондасховішчах, стварэнне найбольш рацыянальнай сістэмы захавання (тэмпературна-вільготны, светлавы, біялагічны рэжымы, адпаведная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўпакоўка, прафілактычная апрацоўка, планавая рэстаўрацыя, кансервацыя і г. д.). Захаванне музейных прадметаў у экспазіцыі. Адкрытае захаванне. Кансервацыя і рэстаўрацыя музейных прадметаў.

### Тэма 2.5 Навукова-экспазіцыйная работа ў музеі

Тыпы музейнай экспазіцыі. Прынцыпы пабудовы музейнай экспазіцыі: ідэйнасць, навуковасць, універсальнасць. Методыка пабудовы музейнай экспазіцыі: сістэматычны, ансамблевы, тэматыка-храналагічны, выбарна-сюжэтны метады. Залежнасць выбару асноўнага метаду пабудовы экспазіцыі ад профілю музея, яго тыпу, мэты і г. д.

Арганізацыя работы над экспазіцыяй. Этапы падрыхтоўкі экспазіцыі: праектаванне і ажыццяўленне. Тры элементы праектавання: навуковае, архітэктурна-мастацкае і тэхнічнае.

Выставачная дзейнасць як сфера экспазіцыйнай работы. Спецыфіка музейных выставак. Класіфікацыя выставак (па тэматыцы, месцы размяшчэння, працягласці). Тыпы выставак. Выстаўка новых паступленняў, выстаўка фондаў, выстаўка з прыватных збораў, мемарыяльная выстаўка, юбілейная выстаўка і інш.

### Тэма 2.6 Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў. Музейная педагогіка

Музейная педагогіка як навуковая дысцыпліна, яе мэты і задачы. Музейная аўдыторыя. Дыферэнцыраваны падыход да музейнай аўдыторыі – галоўны прынцып культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.

Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Экскурсія. Сутнасць музейнай экскурсіі. Прынцыпы класіфікацыі экскурсій.

Методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсіі. Распрацоўка тэматыкі, патрабаванні да метадычных і даведчых матэрыялаў, кантрольны тэкст, экскурс. Паказ і аповяд на экскурсіі. Іншыя базавыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея (лекцыя, лекторый, тэматычныя вечары, музейнае свята, урок-экскурсія, кансультацыйная работа). Музейныя заняткі.

Рэкламна-інфарматыўная дзейнасць музея. Грамадскія сувязі музея. Сістэма ўзаемаадносін музея з іншымі ўстановамі.

Дзіцячы музей. Спецыфіка дзіцячых музеяў. Змены мадэляў дзіцячага музея на працягу ХХ ст.

### Тэма 2.7 Музей установы адукацыі

Умовы стварэння музея ўстановы адукацыі. Фонд арыгінальных музейных прадметаў, наяўнасць памяшкання і абсталявання, якія забяспечваюць захаванасць музейных экспанатаў і ўмовы для іх паказу. Актыў музея (кіраўнік педагог, актыў навучэнцаў).

Профіль музея. Адпаведнасць профіля педагагічнай мэтазгоднасці, характару сабраных калекцый, крыніцам папаўнення (этнаграфічныя, археалагічныя, літаратурныя, мастацкія, музычныя, навуковыя, гісторыі школы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

горада, вёскі і г. д.). Статус музея (грамадскі музей пры школе). Умовы атрымання звання “Народны музей”.

Улік і забеспячэнне захаванасці фондаў. Інвентарная кніга. Адказнасць кіраўніцтва школы, пры якой функцыяніруе музей, за захаванасць фондаў.

Асаблівасці экспазіцыйнай работы музея ўстановы адукацыі. Выкарыстанне музея ў вучэбным працэсе (улік зместу вучэбных праграм па розных прадметах пры выбары матэрыялу для экспазіцыі). Рухомасць школьнай экспазіцыі і прыёмы яе абнаўлення. Паказ у экспазіцыі вынікаў пошукавай работы навучэнцаў. Выставачная дзейнасць.

Формы выкарыстання музея ўстановы адукацыі ў вучэбным і выхаваўчым працэсах. Вучэбна-выхаваўчыя задачы музея ўстановы адукацыі. Формы і метады класнай і пазакласнай работы ў музеі.

Распрацоўка канспектаў заняткаў, сцэнарыяў пазакласных мерапрыемстваў на базе музея. Музей установы адукацыі і краязнаўчая работа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

“Краязнаўства і музеязнаўства” для дзённай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Метадычнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) лекцыі | Форма кантролю ведаў практычныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **1 курс, 1 семестр** | | | | | | | | |
| **1** | **Краязнаўства** | **8** | | **8** | | | | | |
| 1.1 | **Уводзіны. Гісторыя развіцця краязнаўства на Беларусі**<br>Краязнаўства як сістэма ведаў аб пэўнай тэрыторыі, вывучэнне гістарычных, палітычных, культурных, прыродных і іншых фактараў яе фарміравання і развіцця. Формы арганізацыі краязнаўства (дзяржаўнае, грамадскае, школьнае). Выяўленне і фіксацыя (ахова) помнікаў гісторыі і культуры – галоўная задача краязнаўства. Асноўныя віды помнікаў гісторыі і культуры. Заканадаўчыя дакументы Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні помнікаў. Дзяржаўныя і грамадскія ўстановы, якія займаюцца аховай гістарычнай спадчыны.<br>Вывучэнне духоўнай і матэрыяльнай культуры асобных рэгіёнаў Беларусі ў XVII–XVIII стст. Краязнаўчыя матэрыялы ў прыватных калекцыях музейнага тыпу (“Сапежанскі збор”, калекцыя У. Храптовіча ў в. Шчорсы, А. Тызенгаўза ў Гародні, археалагічныя калекцыі К. і Я. Тышкевічаў у Лагойску, палацавая галерэя А.К. Ельскага ў Замосці і інш.). Прынцыпы краёвага вывучэння культуры Беларусі ў пачатку XIX ст.<br>Змены ў беларускім краязнаўстве пасля 1917 г. (усталяванне савецкай улады). Ідэалагізацыя краязнаўчага руху ў сярэдзіне 30-х г. Краязнаўства на Беларусі ў пасляваенны перыяд. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1965 г.). Секцыя па краязнаўству пры фондзе культуры БССР. Закон Рэспублікі Беларусь аб ахове помнікаў гісторыі і культуры. | 2 | | | | | | осн. [3], [5]; доп. [7], [14], [15], [17] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2 | **Помнікі археалогіі ў краязнаўстве.**<br>Археалогія як навука. Крыніцы, мэты і задачы археалагічнага даследавання. Археалагічныя крыніцы па гісторыі і культуры роднага краю.<br>Асноўныя групы археалагічных помнікаў (пасяленні і пахаванні).<br>Віды пахавальных помнікаў: грунтовыя могільнікі і курганы. Эвалюцыя пахавальнага абраду. Неўмацаваныя і ўмацаваныя пасяленні: стаянкі, паселішчы, гарадзішчы, гарады, замкі, крэпасці. Помнікі вытворчай дзейнасці: шахты, майстэрні і г. д. Іншыя віды археалагічных помнікаў.<br>Заканадаўства ў галіне аховы помнікаў археалогіі.<br>Асаблівасці аховы археалагічных помнікаў (ахоўная зона, зона рэгуляванай забудовы і г. д.).<br>Этапы археалагічных даследаванняў. Палявыя даследаванні: археалагічны пошук і раскопкі. Археалагічны пошук як найбольш перспектыўны метад выяўлення археалагічных аб’ектаў. Археалагічныя раскопкі.<br>Асаблівасці даследавання розных катэгорый помнікаў. Першасная (палявая) і лабараторная апрацоўка археалагічных матэрыялаў. Методыка датавання ўзросту помніка. Класіфікацыя і тыпалогія археалагічных знаходак. Рэстаўрацыя і кансервацыя археалагічных знаходак.<br>Выкарыстанне археалагічных матэрыялаў у школе. Актывізацыя вучэбнага і выхаваўчага працэсаў з дапамогай археалагічнага матэрыялу. Методыка падрыхтоўкі і правядзення школьнай экспедыцыі. Палявыя даследаванні. Патрабаванні да вядзення палявой дакументацыі (дзённік экспедыцыі, вопісы, этэкітаж знаходак). Захаванне археалагічных матэрыялаў у школе. | 2 | | | | | | осн. [3], [5];<br>доп. [7], [8], [14], [15] | |
| 1.3 | **Нумізматыка ў краязнаўстве.**<br>Паняцце аб нумізматыцы. Яе месца сярод іншых навук. Станаўленне і развіццё нумізматыкі на Беларусі. Калекцыянiраванне манет у старажытнасці і цяпер. Пераход ад аматарскага збору манет да навукова-аналітычнага даследавання. Узаемасувязь нумізматыкі з гісторыяй, этнаграфіяй і іншымі дысцыплінамі. Галоўныя аспекты нумізматычных даследаванняў. Матэрыяльныя і вонкавыя характарыстыкі манет. Тэхніка і тэхналогія манетнай вытворчасці.<br>Даманетныя сродкі грашовага звароту. Старажытныя крыніцы аб прычынах і часе з’яўлення манет. Старажытныя цэнтры манетнай чаканкі (Лідзія, Эгіна). Манетныя скарбы як галоўны спосаб захоўвання каштоўнасцей у старажытнасці і сярэднявеччы. Асноўныя прынцыпы датавання скарбаў.<br>Навуковая апрацоўка нумізматычных помнікаў. Выкарыстанне нумізматычных помнікаў у школе. Чыстка і кансервацыя манет. Кансервацыя манет. Умовы захавання манетных калекцый. | 2 | | | | | | осн. [3], [5];<br>доп. [8], [17] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Асаблівасці выкарыстання манет падчас урока, лекцыі (ілюстрацыйны фонд, фотаздымкі, слайды, муляжы). Выкарыстанне музейных калекцый і калекцыі нумізматаў-аматараў. | | | | | | | | |
| | Гісторыя грашовага звароту на Беларусі. Першыя манеты на тэрыторыі Беларусі. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XV стст. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XV – срэдзіне XVI ст. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII – сярэдзіне XVIII ст. Галоўныя манетныя двары на тэрыторыі Беларусі і іх прадукцыя. Канец XVIII ст. – 1917 г. – узмацненне пазіцый расійскай манеты ў грашовым абарачэнні на Беларусі. Рэформы 1839–1843, 1895–1897 гг. Савецкія манеты. Грашовая рэформа 1922–1924 гг. Першыя папяровыя грошы і манеты СССР. Увядзенне новага манетнага тыпу (1935 г.). Грашовыя рэформы 1947 і 1961 гг. Чаканка мемарыяльных манет. Апошнія манеты СССР (1991 г.).<br>Грашовыя знакі Рэспублікі Беларусь. | | | 2 | | | | осн. [3], [5]; доп. [8], [17] | Даклады, рэфераты |
| 1.4 | **Геральдыка ў краязнаўстве.**<br>Геральдыка як навуковая дысцыпліна. Яе сувязь з гісторыяй, археалогіяй, нумізматыкай, геніалогіяй і інш. Вытокі геральдыкі. Станаўленне геральдыкі як навукі.<br>Станаўленне і развіццё геральдыкі на Беларусі. Герб – знак, выкананы па законах геральдыкі. Віды гербаў: дзяржаўныя, зямельныя (гарадскія, губернскія і г. д.), карпаратыўныя, радавыя.<br>Асноўныя правілы геральдыкі. Спалучэнне і сімволіка колераў, геральдычныя і негеральдычныя выявы, шафіроўка. Гарадскі герб як сімвал незалежнасці горада. Тыпалогія гарадскіх гербаў Беларусі. Функцыянальныя гербы. Дзяржаўная, абарончая і гаспадарчая сімволіка гарадскіх гербаў. Штучныя гербы. Элементы прыватнаўласніцкай геральдыкі і рэлігійнай сімволікі ў гарадскіх гербах. Этапы развіцця гарадской геральдыкі Беларусі. Раннегеральдычны (да XVI ст.). Геральдычны (XVI – канец XVIII ст.) Познегеральдычны (апошняя чвэрць XVIII ст. – першыя дзесяцігоддзі XX ст.). Гарадская геральдыка Беларусі на сучасным этапе. | | | 2 | | | | осн. [3], [5]; доп. [14], [17] | Тэсты<br><br>Вуснае індывідуальнае і франтальнае апытанне |
| 1.5 | **Тапаніміка ў краязнаўстве.**<br>Тапаніміка як раздзел анамастыкі – навукі аб прыватных назвах. Раздзелы анамастыкі. Тапаніміка – навука аб паходжанні і развіцці геаграфічных назваў; месца сярод іншых навук. Тапаніміка і моваазнаўства, геаграфія і гісторыя. Асноўныя заканамернасці тапанімікі. Прынцыпы класіфікацыі геаграфічных назваў (моўная, семантычная). Тэрміналогія тапанімікі: тапанімічнае асяроддзе, тапанімічныя групы (класы). Тапанімічныя пласты і фарманты. Прынцыпы | | | 2 | | | | осн. [3], [5]; доп. [7], [17] | Складанне фота- і відэапрэзентацый |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | передачы геаграфічных назваў на картах. Трансфармацыя геаграфічных назваў. Практычнае значэнне тапанімікі. Вытокі геаграфічных назваў Беларусі (фактары фарміравання тапонімаў) Беларусі). Сувязь фарміравання тапаніміі Беларусі з этнічнай гісторыяй і працэсамі засялення яе тэрыторыі. Шляхі станаўлення тапонімаў Беларусі.<br>Фактары фарміравання тапонімаў: лінгвістычны, гістарычны, этнічны, прыродны, афіцыйныя змены назваў. Народная тэрміналогія ў тапонімах Беларусі. Прыроднае асяроддзе ў тапонімах Беларусі. Этнатапонімы. Рэлігійна-культавыя тапонімы. Народная і навуковая этымалогія геаграфічных назваў Беларусі. | | | | | | | | |
| 1.6 | **Пісьмовыя крыніцы ў краязнаўстве. Архівы і іх фонды.**<br>Архівы – навукова-даследчыя ўстановы або аддзелы ўстаноў, якія збіраюць і захоўваюць дакументы. Архівы – сукупнасць дакументаў, што назапашваюцца ў выніку дзейнасці ўстаноў або прыватных асоб. Архівы як сховішча пісьмовых крыніц.<br>Гісторыя архіўнай справы. Першыя архівы на тэрыторыі нашай дзяржавы (Метрыка ВКЛ, архівы гарадскіх адміністрацый і магнатаў). Самастойныя архіўныя ўстановы ў XIX ст. Рэарганізацыя і цэнтралізацыя архіўнай справы пасля ўсталявання савецкай улады. Заснаванне адзінага дзяржаўнага архіўнага фонду.<br>Сістэма арганізацыі архіўнай справы ў сучаснай Беларусі. Цэнтральныя дзяржаўныя архівы і іх філіялы. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (Мінск, Гродна), Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь, ЦДА кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск). Стварэнне нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (1992 г.). Структура архіва (функцыянальныя падпарадкаванні архіва). Правілы работы ў архіве. Пошукавыя сістэмы (даведнікі, рэестры вопісаў, спісы фондаў, картачныя каталогі і г. д.). Паслядоўнасць і методыка работы з архіўнымі дакументамі. | | | 2 | | | | осн. [3], [5]; доп. [7], [14], [17] | Даклады, рэфераты |
| 1.7 | **Методыка арганізацыі краязнаўчай работы ў школе.**<br>Асноўныя формы краязнаўчай работы ў школе: класныя і пазакласныя. Масавыя, групавыя і індывідуальныя формы работы.<br>Выкарыстанне краязнаўчых матэрыялаў на ўроках. Пазакласная краязнаўчая работа. Работа школьнага краязнаўчага музея.<br>Арганізацыя і правядзенне краязнаўчых паходаў, экскурсій, экспедыцый. Выбар мэты, вызначэнне задачы. Нарматыўныя дакументы аб правядзенні паходу, экскурсіі, экспедыцыі. Гігіена турыста. Самакантроль і віды першай дапамогі ў паходзе. Вывучэнне раёна паходу, экскурсіі, экспедыцыі. Распрацоўка маршруту, графік руху, схема маршруту. Запісы гісторыка-краязнаўчых назіранняў. Вядзенне дзённіка. Падвядзенне вынікаў паходу, экскурсіі, экспедыцыі. | 2 | | | | | | осн. [3], [5]; доп. [17], [19] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Краязнаўчы гурток – асноўная форма пазакласнай краязнаўчай работы ў школе. Мэты і задача гуртка. Накіраванасць гуртка (гісторыка-культурная, гісторыка-літаратурная і г. д.) у залежнасці ад канкрэтных умоў і ўзроставых асаблівасцей дзяцей. Камплектаванне гуртка. Распрацоўка праграмы работы гуртка. Спалучэнне ў ёй розных форм работы: тэарэтычнай, практычнай, самастойнай, экскурсій, паходаў, экспедыцый. | | | | | | | | |
| **2** | **Музеязнаўства** | **8** | | **8** | | | | | |
| 2.1 | **Уводзіны. Музей як сацыяльны інстытут.**<br>Роля музея ў захаванні агульначалавечай спадчыны. Этымалогія паняцця “музей”.<br>Музеязнаўства як навуковая дысцыпліна, яе месца ў сістэме іншых навук. Прадмет даследавання музеязнаўства. Асноўныя паняцці музеязнаўства: музей, музейны прадмет, музейная справа.<br>Гісторыя ўзнікнення і развіцця музея як сацыяльнага інстытута. Перадмузейны перыяд збіральніцтва. Працэс назапашвання рэчаў у першабытнам грамадстве: зборы эканамічнага значэння і сацыяльнага прэстыжу. Прыватнае збіральніцтва ў краінах Старажытнага Усходу, калекцыі культавых рэчаў, мастацкіх твораў, матэрыяльных каштоўнасцей у храмах, палацах, бібліятэках Старажытнага Егіпта, Вавілона, Асірыі і інш. Зборы мастацкіх каштоўнасцей у храмах антычных гарадоў – праабразы мастацкіх музеяў.<br>Перадмузейныя формы збіральніцтва ў перыяд Сярэднявечча: калекцыі культавых рэчаў у цэрквах і манастырах.<br>Змены ў падыходах да прыватнага збіральніцтва ў эпоху Адраджэння. Узнікненне сістэматычных калекцый мастацкіх твораў, натуральных рэчаў музейнага прызначэння: мюнцкабінеты, натуркабінеты, кунсткамеры. Калекцыі твораў мастацтва ў Ватыкане, калекцыі сям’і Медзічы ў Фларэнцыі. Дзяржаўныя скарбніцы. Заснаванне кунсткамеры ў Дрэздэне. Аружэйная палата ў Маскве.<br>Музейная справа ў эпоху Асветніцтва (другая палова XVII – XVIII ст.). Адлюстраванне асветніцкай ідэалогіі ў музейнай справе. Перамены ў падыходах да калекцыяніравання ў другой палове XVII ст., звязаныя са зменай сацыяльных функцый збіральніцтва. Росквіт палацавых калекцый. Эрмітаж (Санкт-Пецярбург), Луўр (Парыж), Цвінгер (Дрэздэн). Абмежаванасць для наведвання першых імператарскіх музеяў. Пераход да перыядычнай закупкі мастацкіх твораў. Першыя спробы класіфікацыі музейных прадметаў і спецыялізацыі музеяў, звязаныя з развіццём і дыферэнцыяцыяй навук. Адкрыццё першых публічных музеяў. Брытанскі музей (1753), Луўр (1793). Пецярбургская кунсткамера (1719) – першы публічны музей Расіі. Асаблівасці прыватных палацавых галерэй і калекцый. Роля збіральніцтва ў развіцці навукі і мастацкай культуры. Лёс | 2 | | | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [6], [18], [20] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | калекцыі Чартарыйскіх. Калекцыі сям'і Баргезе (Рым), галерэі Піцці і Уфіцы (Фларэнцыя). | | | | | | | | |
| | Музейная справа ў XIX – пачатку XX ст. "Залаты век" музеяў мастацкага профілю. Рэарганізацыя існуючых мастацкіх музеяў і адкрыццё новых. Прада (1819), Лонданская Нацыянальная галерэя (1824), Старая Мюнхенская пінакатэка (1836).<br>Уплыў росту нацыянальнай самасвядомасці на развіццё нацыянальных музеяў. Першыя спробы стварэння канцэпцыі нацыянальнага музея Ф. Адэлунга (1817). Узнікненне самастойных музейных устаноў шырокага гістарычнага профілю. Венгерскі Нацыянальны музей у Будапешце (1802), Нацыянальны музей у Празе (1818), Стары музей у Берліне (1828), Нацыянальны музей у Кракаве (1879), Егіпецкі музей у Каіры (1858) і інш. Рост і ўскладненне сеткі музеяў гістарычнага профілю, з'яўленне спецыялізаваных археалагічных музеяў. Развіццё ваенна-гістарычных музеяў. Літаратурна-мемарыяльныя музеі. Музей Шылера ў Марбахе (1857), музей Гётэ ў Веймары (1886).<br>Асаблівасці ўтварэння Метраполітэн музея ў Нью-Йорку (1870). Дзейнасць І.В. Цвятаева па стварэнні "Музея прыгожых мастацтваў" (1890). "Маскоўская гарадская галерэя Паўла і Сяргея Траццяковых" (1856; 1892). Павелічэнне ролі музеяў у навуковай і адукацыйнай дзейнасці.<br>Навукова-даследчая і навукова-адукацыйная функцыі музея ў канцы XIX – пачатку XX ст. Навуковыя музеі і музеі пры навучальных установах. Ашмоліян-музей у Оксфардзе (1845). Мастацка-прамысловыя музеі і музеі рамёстваў, прамысловыя і тэхнічныя музеі. Кенсінгтонскі музей навукі і тэхнікі (1852), Маскоўскі політэхнічны музей (1872). Стварэнне новага тыпу музея – музея пад адкрытым небам. Дзейнасць А. Хазеліуса па стварэнні "Скансэна" (1891). Асноўныя фактары павелічэння колькасці музеяў пад адкрытым небам у краінах паўночнай Еўропы ў канцы XIX – пачатку XX ст.<br>Асаблівасці развіцця музеяў Еўропы і Амерыкі ў сярэдзіне – канцы XX ст. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы, пагаршэнне ў выніку гэтага навукова-даследчай, збіральніцкай, фондавай і культурна-адукацыйнай працы. Страты музейных каштоўнасцей падчас другой сусветнай вайны.<br>Пашырэнне сферы дзейнасці музеяў у другой палове XX ст. Развіццё музейнай справы ў розных рэгіёнах свету пасля вайны. Фарміраванне і развіццё музеялогіі як навуковай дысцыпліны. Стварэнне сеткі музейных навуковых і даследчых цэнтраў. Сучасныя тэндэнцыі і напрамкі ў развіцці музеязнаўства. Экамузеялогія. Асноўныя прынцыпы арганізацыі і дзейнасці экамузеяў. Першыя тэарэтычныя і практычныя спробы рэалізацыі ідэі стварэння экамузеяў у Францыі. Музей | | | 2 | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [6], [18], [20] | Складанне фота- і відэапрэзен-тацый, даклады |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | чалавека і прамысловасці абшчыны Ле Крэзо. Міжнародны рух за новую музеялогію.<br>Міжнародныя музейныя ўстановы (ICOM, 1964). | | | | | | | | |
| 2.2 | **Гісторыя развіцця музейнай справы ў Беларусі.**<br>Крыніцы вывучэння музейнай справы (арыгінальныя апісанні і каталогі, музеязнаўчыя выданні, каталогі музеяў, манаграфічныя даследаванні, працы музеяў, музеязнаўчыя часопісы і г. д.).<br>Старажытнабеларускае збіральніцтва (вялікакняжацкія зборы і зборы рэчаў культавага прызначэння). Прыватнае збіральніцтва. Калекцыі унікальных помнікаў матэрыяльнай культуры, фамільных рэліквій, рэдкіх кніг, рукапісаў у маёнтку Радзівілаў у Нясвіжы, “Сапежанскі збор”.<br>Перамены ў падыходах да прыватнага калекцыяніравання ў другой палове XVIII ст. Палацавыя галерэі і прыватнашляхецкія зборы І. Храптовіча (Шчорсы), А. Тызенгаўза (Гродна) і інш. Узнікненне першых музеяў пры навучальных установах, іх роля ў развіцці даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, дакладных навук. Музей пры Полацкай калегіі езуітаў. “Кабінет натуральнай гісторыі” Гродзенскай медыцынскай школы.<br>Драбленне і вываз калекцый з беларускіх зямель пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Лёс “Музеўма айчыннай прамысловасці” Горы-Горыцкага прамысловага інстытута. Віленскі музей старажытнасцей – першы агульнадаступны музей на Беларусі (1856).<br>Тэндэнцыі развіцця музеяў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Царкоўна-археалагічныя музеі, музеі пры земствах, навуковых таварыствах, навучальных установах. Прыватныя калекцыі ў другой палове XIX ст.<br>Змены ў музейнай справе пасля 1917 г. Заканадаўчыя акты савецкага ўрада па музейнай справе. Нацыяналізацыя культурна-гістарычных каштоўнасцей. Дзяржаўныя ўстановы па кіраванні музеямі. Стварэнне музейнай сеткі і нацыянальнага музейнага фонду.<br>Беларускі дзяржаўны музей і яго філіялы. Роля М. Шчакаціхіна ў стварэнні нацыянальнага беларускага музея. Краязнаўчыя музеі ў Заходняй Беларусі. Развіццё Беларускага музея І. Луцкевіча ў Вільні (1921–1946 гг.). Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Палескі музей у Пінску. Дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы ў 30-я гг. XX ст., рабаўніцтва і продаж найкаштоўнейшых музейных прадметаў, рэпрэсіі ў адносінах да супрацоўнікаў музеяў.<br>Музеі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Страты часткі музейнага фонду падчас акупацыі. Аднаўленне і развіццё музейнай сеткі ў пасляваенны час. | 2 | | | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [8], [9], [10], [11] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Змяненне сістэмы кіравання музеямі, падпарадкаванне музеяў Міністэрству культуры БССР. Пашырэнне музейнай сеткі. Павелічэнне колькасці музеяў ваенна-гістарычных, мемарыяльных, працоўнай і баявой славы. Рост сеткі грамадскіх музеяў. Звужэнне функцый музеяў у 50–70-я гг., падпарадкаванне іх палітычным мэтам. Праблемы забеспячэння музеяў спецыялістамі. | | | | | | | | |
| 2.3 | **Сістэма арганізацыі музейнай справы ў сучаснай Беларусі.**<br>Характарыстыка сучаснага становішча музейнай справы ў Беларусі. Законы Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992), "Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" (1996).<br>Класіфікацыя музеяў. Прынцыпы дзялення музеяў на групы. Дзяленне музеяў па юрыдычным статусе (дзяржаўныя, грамадскія, прыватныя). Якасная тыпалогія (публічныя, навуковыя, вучэбныя). Дзяленне музеяў па іерархічнай падпарадкаванасці (цэнтральныя, мясцовыя, абласныя і г. д.). Ведамасная прыналежнасць музеяў.<br>Асноўныя профільныя групы музеяў. Музеі комплекснага профілю. Тыпы музеяў (музей пад адкрытым небам, скансэн, музей-запаведнік, мемарыяльны музей, дом-музей і г. д.). Музей народнай архітэктуры і побыту. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе". Полацкі гісторыка-архітэктурны музей-запаведнік.<br>Музейная сетка Беларусі. Галаўны музей і яго філіялы. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі, Нацыянальны мастацкі музей, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, філіялы рэспубліканскіх музеяў, абласныя музеі, мясцовыя краязнаўчыя музеі.<br>Катэгорыі музея. Параметры вызначэння катэгорыі музея (месца ў дзяржаўнай сістэме музеяў, аб'ём асноўнага фонду, экспазіцыйная плошча, колькасць наведванняў і г. д.). | | | 2 | | | | осн. [2], [4]; доп. [8], [9], [10], [11] | Вуснае індывідуальнае і франтальнае апытанне |
| 2.4 | **Структура музея і асноўныя напрамкі дзейнасці. Навукова-фондавая работа музея.**<br>Структурныя аддзелы сучаснага музея. Навуковая рада, яе роля ў каардынацыі дзейнасці музея. Навукова-метадычная рада, яе задачы па пытаннях камплектацыі, экспазіцыйнай, культурна-адукацыйнай дзейнасці і г. д. Фондава-закупачная камісія. Вызначэнне каштоўнасці і мэтазгоднасці закупкі тых або іншых прадметаў, уключэнне іх у склад таго ці іншага збору, калекцыі і г. д. Навуковыя аддзелы, іх месца ў структуры музея.<br>Фарміраванне фондавага збору – асноўны напрамак дзейнасці музея. Навуковая канцэпцыя камплектавання – сістэмнае ўяўленне аб мэтах, напрамках, формах і метадах камплектавання фондаў музея і як аснова дзейнасці ўсіх падпарадкаванняў музея. Метады камплектавання (тэматычнае і сістэматычнае). | 2 | | | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [6], [18] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Формы камплектавання (збіральніцкая дзейнасць, экспедыцыя, камандзіроўка). Формы бягучага камплектавання (закупка, абмен, перадача ў дар, перадача на часовае захаванне).<br>Улік і захаванне музейных фондаў. Нарматыўныя дакументы па ўліку і захаванні. Уліковая навукова-фондавая дакументацыя як умова юрыдычнай аховы музейнага збору.<br>Склад і структура музейных фондаў. Асноўныя элементы структуры музейных фондаў. Вывучэнне і навуковае апісанне музейных прадметаў. Атрыбуцыя. Вызначэнне аўтэнтычнасці, сапраўднасці. Музейная каштоўнасць прадмета. Вопісы калекцый.<br>Забеспячэнне захаванасці музейных прадметаў у спецыяльна прыстасаваных фондасховішчах, стварэнне найбольш рацыянальнай сістэмы захавання (тэмпературна-вільготны, светлавы, біялагічны рэжымы, адпаведная ўпакоўка, прафілактычная апрацоўка, планавая рэстаўрацыя, кансервацыя і г. д.). Захаванне музейных прадметаў у экспазіцыі. Адкрытае захаванне. Кансервацыя і рэстаўрацыя музейных прадметаў. | | | | | | | | |
| 2.5 | **Навукова-экспазіцыйная работа ў музеі.**<br>Тыпы музейнай экспазіцыі. Прынцыпы пабудовы музейнай экспазіцыі: ідэйнасць, навуковасць, універсальнасць. Методыка пабудовы музейнай экспазіцыі: сістэматычны, ансамблевы, тэматыка-храналагічны, выбарна-сюжэтны метады. Залежнасць выбару асноўнага метаду пабудовы экспазіцыі ад профілю музея, яго тыпу, мэты і г. д.<br>Арганізацыя работы над экспазіцыяй. Этапы падрыхтоўкі экспазіцыі: праектаванне і ажыццяўленне. Тры элементы праектавання: навуковае, архітэктурна-мастацкае і тэхнічнае. Выставачная дзейнасць як сфера экспазіцыйнай работы. Спецыфіка музейных выставак. Класіфікацыя выставак (па тэматыцы, месцы размяшчэння, працягласці). Тыпы выставак. Выстаўка новых паступленняў, выстаўка фондаў, выстаўка з прыватных збораў, мемарыяльная выстаўка, юбілейная выстаўка і інш. | | | 2 | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [6], [18], [20] | Даклады, рэфераты |
| 2.6 | **Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў. Музейная педагогіка.**<br>Музейная педагогіка як навуковая дысцыпліна, яе мэты і задачы. Музейная аўдыторыя. Дыферэнцыраваны падыход да музейнай аўдыторыі – галоўны прынцып культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.<br>Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Экскурсія. Сутнасць музейнай экскурсіі. Прынцыпы класіфікацыі экскурсій.<br>Рэкламна-інфарматыўная дзейнасць музея. Грамадскія сувязі музея. Сістэма ўзаемаадносін музея з іншымі ўстановамі. | 2 | | | | | | осн. [1], [2], [4]; доп. [13], [19] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзіцячы музей. Спецыфіка дзіцячых музеяў. Змены мадэляў дзіцячага музея на працягу ХХ ст. Методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсіі. Распрацоўка тэматыкі, патрабаванні да метадычных і даведчых матэрыялаў, кантрольны тэкст, экскурс. Паказ і аповяд на экскурсіі. Іншыя базавыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея (лекцыя, лекторый, тэматычныя вечары, музейнае свята, урок-экскурсія, кансультацыйная работа). Музейныя заняткі. | | | | | | | | |
| 2.7 | **Музей установы адукацыі.**<br>Умовы стварэння музея ўстановы адукацыі. Фонд арыгінальных музейных прадметаў, наяўнасць памяшкання і абсталявання, якія забяспечваюць захаванасць музейных экспанатаў і ўмовы для іх паказу. Актыў музея (кіраўнік педагог, актыў навучэнцаў).<br>Профіль музея. Адпаведнасць профіля педагагічнай мэтазгоднасці, характару сабраных калекцый, крыніцам папаўнення (этнаграфічныя, археалагічныя, літаратурныя, мастацкія, музычныя, навуковыя, гісторыі школы, горада, вёскі і г. д.). Статус музея (грамадскі музей пры школе). Умовы атрымання звання “Народны музей”.<br>Улік і забеспячэнне захаванасці фондаў. Інвентарная кніга. Адказнасць кіраўніцтва школы, пры якой функцыяніруе музей, за захаванасць фондаў.<br>Асаблівасці экспазіцыйнай работы музея ўстановы адукацыі.<br>Выкарыстанне музея ў вучэбным працэсе (улік зместу вучэбных праграм па розных прадметах пры выбары матэрыялу для экспазіцыі). Рухомасць школьнай экспазіцыі і прыёмы яе абнаўлення. Паказ у экспазіцыі вынікаў пошукавай работы навучэнцаў. Выставачная дзейнасць.<br>Формы выкарыстання музея ўстановы адукацыі ў вучэбным і выхаваўчым працэсах. Вучэбна-выхаваўчыя задачы музея ўстановы адукацыі. Формы і метады класнай і пазакласнай работы ў музеі.<br>Распрацоўка канспектаў заняткаў, сцэнарыяў пазакласных мерапрыемстваў на базе музея. Музей установы адукацыі і краязнаўчая работа. | | | 2 | | | | осн. [2], [4]; доп. [13], [19] | Складанне планаў-канспектаў фрагментаў экскурсіі або музейных і краязнаўчых заняткаў |
| | **Усяго** | **16** | | **16** | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Гужалоўскі, А.А. Беларуская музеялогія – Бібліяграфічны паказальнік / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 145 с.

2. Основы музееведения : учеб. пособие / Т.В. Абанкина, К.З. Акопян, Л.Е. Востряков и др. ; отв. ред. Э.А. Шулепова. – Изд. 3-е. – М. : КД Либроком, 2013. – 430 с.

3. Русак, В.У. Краіназнаўства і краязнаўства: вучэб.-метад. дапаможнік / В.У. Русак. – Мінск : БДТУ, 2011. – 228 с.

4. Тельчаров, А.Д. Музееведение / А.Д. Тельчаров. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Научный мир, 2011. – 180 с.

5. Шамов, В.П. Краеведение Беларуси : пособие / В.П. Шамов. – Минск: РИПО, 2014. – 302 с. : ил.

**Дадатковая:**

6. 100 великих музеев мира / авт.-сост. Н. А. Ионина. – М. : Вече, 2011. – 431 с.

7. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси. XVI–30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

8. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн імя П. Броўкі, 1993. – 702 с.

9. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1941 – 1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2004. – 218 с.

10. Гужалоўскі, А. А. Нараджэнне беларускага музея / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – 124 с.

11. Гужалоўскі, А.А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с. : іл.

12. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1918 – 1941 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2002. – 176 с.

13. Залуцкая, В.Л. Вучэбныя экскурсіі : падрыхтоўка і правядзенне : метадычныя рэкамендацыі / В.Л. Залуцкая; Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка. – Мінск: БГПУ, 2009. – 54 с.

14. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

15. Локотко, А.И. Историко-культурные регионы Беларуси / А.И. Локотко; Европейский гуманитарный ун-т. – Минск: ЕГУ, 2002. – 226 с.

16. Несцярчук, Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 286 с.

17. Никонова, М.А. Краеведение : учеб. пособие для высших педагогических учебных заведений / М.А. Никонова. – М.: Академия, 2009. – 187 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

18. Сташкевіч, А.Б. Справаздача аб арганізацыі і правядзенні Нацыянальнага трэнінгу ЮНЕСКА/ІКОМ па сучаснаму музейнаму менеджменту для музейных спецыялістаў Рэспублікі Беларусь / А.Б. Сташкевіч. – Мінск: 2009. – 50 с.

19. Торхова, А.В. Художественное краеведение в воспитании школьников: Пособие для педагогов / А.В. Торхова. – Минск : Беларусь, 2000. – 126 с.

20. Шереметьева, Т.Л., 100 музеев мира, которые необходимо увидеть / Т.Л. Шереметьева. – М. : Харвест, 2011. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў па факультатыўнай дысцыпліне “Краязнаўства і музеязнаўства” рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя метады:

- даклады;
- рэфераты;
- вуснае індывідуальнае і франтальнае апытанне;
- тэсты;
- складанне фота- і відэапрэзентацый (практыкаарыентаванае заданне);
- складанне планаў-канспектаў фрагментаў экскурсій або музейных і краязнаўчых заняткаў (практыкаарыентаванае заданне).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай дысцыпліны | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Сусветная мастацкая культура | Тэорыі і методыкі выкладання мастацтва | Пазбягаць дубліраванне вучэбнага матэрыялу пры вывучэнні гісторыі развіцця і сучаснага стану музеяў свету | Пратакол № 14 ад 14.06.2016 г. |
| Методыка выкладання сусветнай мастацкай культуры | Тэорыі і методыкі выкладання мастацтва | Пазбягаць дубліраванне вучэбнага матэрыялу пры вывучэнні методыкі і форм арганізацыі краязнаўчай работы | Пратакол № 14 ад 14.06.2016 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ К УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЕ
УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «КРАЯЗНАЎСТВА І МУЗЕЯЗНАЎСТВА»
(специальность 1-03 01 08 Музыкальное искусство и мировая художественная культура)
на 2019/2020 учебный год

| №№ пп | Дополнения и изменения | Основание |
|---|---|---|
| 1 | Заменить список основной литературы следующими источниками:<br>1. Художественная культура Беларуси: электронный учебно-методический комплекс для специальности 1-03 01 07 Музыкальное искусство, ритмика и хореография [Электронный ресурс] / сост. Ю. Ю. Захарина, М. А. Шатарова. – Режим доступа : https://elib.bspu.by/handle/doc/45146. – Дата доступа : 15.01.2020.<br>2. Мировая художественная культура: электронный учебно-методический комплекс для специальности 1-03 01 08 Музыкальное искусство и мировая художественная культура [Электронный ресурс] / сост. Ю. Ю. Захарина. – Режим доступа : https://elib.bspu.by/handle/doc/44618. – Дата доступа : 15.01.2020. | 1. Обновление списка основной литература в связи с истечением срока действия грифованых учебных пособий<br>2. Прохождение государственной регистрации ЭУМК по данной дисциплине. |

Учебная программа пересмотрена и одобрена на заседании кафедры теории и методики преподавания искусства (протокол № 6 от 27.01.2020)

Заведующий кафедрой
теории и методики преподавания искусства
доктор искусствоведения, доцент ________ Ю.Ю.Захарина

УТВЕРЖДАЮ
Декан факультета эстетического образования
кандидат пед. наук, доцент ________ И.И.Рыжикова

Методист УМО ________ Е.А.Кравченко